■ На слыху

# Курсы валют залежаць ад знешніх фактараў

## Аналітыкі ўпэўнены: калі расійскі рубель не адновіцца, долар і ў нас значна падаражэе

**Дынаміка курсаў валют у Беларусі на гэтым тыдні абумоўлена падзеямі ў Расіі. З-за пашырэння санкцый з боку ЗША расійскі рынак сутыкнуўся з уцёкамі капіталу, да якога, відавочна, дадалася і спекуляцыйная атака, лічыць фінансавы кансультант Жанна КУЛАКОВА. За два гандлёвыя дні расійскі рубель страціў да бівалютнага кошыка Цэнтрабанка Расіі 8,3 %, і падзенне пакуль працягваецца.**

На рынку відавочна паніка, і пакуль яна не ўляжацца, цяжка з упэўненасцю прагназаваць, наколькі глыбокім акажацца падзенне. Аднак вельмі вялікая магчымасць, што неўзабаве пачнецца карэкцыя і расійскі рубель умацуецца. Тым больш што рэзка патаннелі акцыі і расійскі рубель — добрая нагода за невысокі кошт закупіцца каштоўнымі паперамі суседкі і яе валютай.

Магчымыя негатыўныя наступствы для валютнага рынку нашай краіны пакуль што згладжваюцца праз курс расійскага рубля — ён значна ўпаў. Па выніках таргоў, 10 красавіка курс расійскага рубля склаў 3,2507, і гэта самы нізкі ўзровень са жніўня 2017 года. Такое падзенне можа негатыўна адбіцца на экспарце — гандлёвая залежнасць Беларусі ад Расіі нікуды не знікла. З-за ўмацавання беларускага рубля да расійскага тавары беларускай вытворчасці даражэюць для Расіі. Гэта можа прывесці да скарачэння экспартнай выручкі і паслаблення беларускага рубля.

Магчыма, курс расійскага рубля ў Беларусі ў агляднай будучыні вернецца да адзнакі 3,4. Калі пры гэтым курс расійскага рубля ў Расіі застанецца на бягучых адзнаках, то курс долара ў Беларусі наблізіцца да адзнакі 2,1. Калі б не сённяшняе падзенне курса расійскага рубля, то долар ужо сёння каштаваў бы прыкладна столькі ж.

Калі расійскі рубель усё ж адкарэктуецца і курс долара ў Расіі ўпадзе з бягучых 63 да 60 рублёў, то курс «бакса» ў Беларусі можа вырасці прыкладна да 2,05 (пры ўмове вяртання курса расійскага рубля да адзнакі 3,4). Гэтыя разлікі актуальныя для бягучых суадносін еўра і долара (1,235).

«У любым выпадку не думаю, што беларусам варта разлічваць на хуткае вяртанне курса долара да адзнакі 1,95, — расійская эканоміка пацярпела з-за санкцый, і расійскі рубель яшчэ доўга застанецца больш слабым, чым быў усяго некалькі дзён таму», — упэўнена Жанна Кулакова.

Акрамя таго, важна разумець, што ў цяперашняй палітычнай сітуацыі геапалітычныя рызыкі для расійскага рубля будуць захоўвацца заўсёды. Некаторыя з іх вядомыя — напрыклад, цяпер у ЗША будзе разглядацца законапраект аб забароне на інвестыцыі ў расійскія аблігацыі. Калі яго прымуць — распродаж расійскіх актываў працягнецца (дарэчы, на руках нерэзідэнтаў знаходзіцца прыкладна трэць усіх выпушчаных аблігацый федэральнай пазыкі). Але дадзеная сітуацыя — хутчэй выключэнне з правілаў, часцей геапалітычныя фактары ўсплываюць нечакана, адбыцца гэта можа ў любы момант. Пра гэта трэба памятаць усім, для каго важныя курсы валют і ў нашай краіне, і ў Расіі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

***P.S.*** По стане на 11 красавіка, долар за дзень яшчэ падаражэў на 4,4 капейкі, а еўра — на 7 капеек. ■

■ Фінансы

# Інфляцыя ў сакавіку 0,8 %

**Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў сакавіку ў параўнанні з лютым склаў 100,8 %, а са снежнем 2017 года — 102,5 %.**

Базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, схільныя да ўплыву фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у сакавіку гэтага года ў параўнанні з лютым склаў 100,5 %, а са снежнем мінулага года — 101,4 %.

Зусім нязначна (на 0,6 %) у сакавіку падаражэлі харчовыя тавары. А вось кошты на нехарчовыя тавары ў мінулым месяцы выраслі на 0,9 % (з пачатку года — на 1,9 %). Больш за ўсё ў сакавіку падаражэлі платныя паслугі — на 1,1 % (з пачатку года — на 4,2 %).

**Сяргей КУРКАЧ** ■

# МАРЫ ПРА ЛІПЫ



***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У цэлым пытанне мэтазгоднасці такой работы даволі спрэчнае. Бо папярэднікі гэтых маладых ліп выдалілі не проста так. Вось і апошнія даследаванні паказалі перавышэнне ўзроўню забруджанасці па солях натрыю на праспекце Незалежнасці аж у 68 разоў. Агляды выявілі: пупышкі на большасці дрэў, што растуць уздоўж праезнай часткі, спаліла соль, якая на іх асядала. Зараз такія галінкі прыйдзецца выдаліць, а потым чакаць, калі прачнуцца новыя пупышкі. Акрамя таго, наяўнасць солі ў глебе перашкаджае засваенню вільгаці раслінамі, вядзе да парушэння фізіёлага-біяхімічных працэсаў і наступнага аслаблення. Нават калі дрэва паліта, яно не можа атрымаць вільгаць з глебы і перманентна адчувае засуху.

Як растлумачыў **загадчык сектара маніторынгу расліннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя Купрэвіча Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр СУДНІК**, уздзеянне чалавека на навакольнае асяроддзе бывае некалькіх тыпаў. Прамы ўплыў — высечка, абрэзка, будаўнічыя работы, ушчыльненне глебы, механічнае пашкоджанне каранёў, кроны, ствалоў дрэў і іншае. І ўскоснае, звязанае са змяненнем асяроддзя, — адсутнасцю дастатковай вільгаці, забруджваннем глебы і паветра. Тыпаў уздзеяння некалькі, аднак вынік часцей за ўсё адзін: пашкоджанні дрэў рознай ступені цяжкасці.

Адна з галоўных умоў выбару роду і віду дрэў для высадкі ў гарадскім асяроддзі — здольнасць захоўваць нармальную жыццядзейнасць, нягледзячы на прысутнасць у атмасферы шкодных газаў. Усе тры роды найбольш распаўсюджаных у сталіцы дрэў — ліпа, клён, каштан — валодаюць гэтай уласцівасцю. Значна складанейшая сітуацыя з солеўстойлівасцю. У зімовы перыяд у нашай краіне дарогі апрацоўваюць тэхнічнай соллю, якая практычна цалкам складаецца з хларыду натрыю, выкарыстоўваючы яе альбо ў чыстым выглядзе, альбо ў сумесі з пяском у суадносінах 1:1. Яе перавага — нізкі кошт. Але фінансавая эканомія з лішкам кампенсуецца моцным негатыўным уздзеяннем на навакольнае асяроддзе. Асеўшы на ігліцы і парастках соль выклікае іх абязводжванне, а пры пранікненні ў тканкі — пашкоджанне. У ліку магчымых наступстваў — солевыя апёкі, змяненне структуры расліны, адставанне ў росце і развіцці, некроз ігліцы і лісця, іх заўчаснае ападзенне.

## Ад карысці да шкоды — адзін крок

Не толькі непасрэдна шкодныя рэчывы наносяць страты зялёным насаджэнням, не менш пагібельнай праяўляе сябе, здавалася б, такая пазітыўная з'ява, як развіццё гарадской гаспадаркі. Будаўнічыя работы, якія праводзяцца ў непасрэднай блізкасці ад дрэва, — непазбежны фактар рызыкі для яго. Часта пры пракладцы трас камунікацый, выкопванні катлаванаў і траншэй, рамонце і будаўніцтве дарог, брукаванні дарожак і падсыпцы грунтоў пашкоджваецца каранёвая сістэма. Складаванне будматэрыялаў, устаноўка бытовак і заезд цяжкай тэхнікі ўшчыльняюць глебу да крытычнага стану. Каранёвым лапам, ствалам і галінам дрэў, хай і выпадкова, наносяцца раны. Кожнае такое пашкоджанне адмоўна ўплывае на стан дрэва. Калі за кароткі час пашкоджанняў здарыцца некалькі, то стан дрэва пагаршаецца. Саслабленае ў выніку ненаўмыснага ўздзеяння чалавека дрэва лёгка становіцца аб'ектам нападу шкоднікаў і патагенных арганізмаў.

Расшырэнне дарог, накіраванае на стварэнне камфортных умоў для аўтамабілістаў, прыводзіць да таго, што дрэвы аказваюцца ў непасрэднай блізкасці ад праезнай часткі. Хоць па нарматывах адлегласць ад палатна дарогі да ствала дрэва павінна быць не менш, чым 2,1 метра. Аднак горадабудаўнікам гэтыя прадпісанні здаюцца не надта істотнымі і нарматывы часта прыносяцца ў ахвяру зручнасці. Калі дрэвы пасаджаны ў два рады, то розніцу паміж імі заўважыць любы, нават не біёлаг. Дрэвы, якія растуць уздоўж дарогі, будуць значна больш пашкоджаныя. Напрыклад, тыя самыя ліпы, род, які валодае высокай газаўстойлівасцю: першы шэраг — дрэвы з высахлым лісцем, якія пакутуюць ад розных пашкоджанняў і хвароб, другі шэраг — вонкава здаровыя экземпляры з зялёнай кронай.

Яшчэ адзін значны фактар, акрамя адлегласці ад праезнай часткі, — памеры лункі, у якую высаджваецца дрэва. Адлегласць ад ствала дрэва да краю лункі павінна быць не менш за метр, што, вядома, вялікая рэдкасць ва ўмовах шчыльнай забудовы вялікага горада. А тым больш галоўнага праспекта.

Дарэчы, зялёныя насаджэнні пакутуюць не толькі ад хімічных пашкоджанняў, але і ад механічных. Ручныя косы ў сталічнай гаспадарцы ўжо практычна цалкам выцесненыя трымерамі, якія, хоць і значна больш хуткія, аднак менш «манеўраныя», таму падчас пакосу дрэвы часта становяцца ахвярамі іх неакуратнага выкарыстання. У памяць пра гэта на ніжняй частцы ствала застаюцца і доўга не загойваюцца «шнары».

Застаецца верыць, што пасаджанным на праспекце ліпам удасца пазбегнуць лёсу сваіх папярэдніц. Толькі ўявіце гэты шум прыгожых, здаровых дрэў у самым цэнтры горада. Мара?

**Дар'я КАСКО.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## БРЫГАДА ЗАКАНЧВАЕ МАРШ

**Ва Узброеных Сілах Беларусі працягваецца праверка, распачатая па даручэнні Прэзідэнта. Нагадаем, што падчас яе з запасу былі прызваны каля 2 тысяч ваеннаабавязаных. У гэтыя дні брыгада з імі завяршае марш у раён сканцэнтравання.**

— Упершыню з моманту стварэння 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады яна была адмабілізавана і прыведзена ў баявую гатоўнасць, — зазначыў міністр абароны Андрэй Раўкоў падчас выязнога пасяджэння «Дэпутацкага клуба» ў гэтым злучэнні. — Сёння брыгаду чакае агляд гатоўнасці да выканання задач. Неўзабаве прызваныя з запасу вернуцца дадому.

Тое, як прайшла праверка, яшчэ стане прадметам глыбокага аналізу. Але, па словах Андрэя Раўкова, папярэднія вынікі дэманструюць здольнасць войскаў прывесці сябе ў стан поўнай баявой гатоўнасці і выканаць пастаўленыя перад імі задачы. Самі ж праверкі боегатоўнасці праходзяць пастаянна. Яны ахопліваюць шмат аспектаў — ад прызыву ваеннаабавязаных да забеспячэння неабходнымі рэсурсамі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## СУАЙЧЫННІКІ ТРАПІЛІ Ў АВАРЫЮ

**У выніку ДТЗ у Пскоўскай вобласці пацярпелі шэсць беларусаў.**

Па інфармацыі прэс-службы рэгіянальнага ўпраўлення МУС па вобласці, каля пяці гадзін раніцы на 258-м кіламетры аўтадарогі Санкт-Пецярбург — Невель у Струга-Красненскім раёне адбылася аварыя, у выніку якой шэсць чалавек атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці. Мяркуецца, што кіроўца трактара «Вольва» пры развароце не ўпэўніўся ў бяспецы манеўру, з прычыны чаго адбылося сутыкненне з аўтамашынай «Мерседэс».

У мікрааўтобусе знаходзіліся дзевяць грамадзян Беларусі. Па апошняй інфармацыі, тры чалавекі шпіталізаваны з пераломамі і іншымі траўмамі, тры — з ударамі і рванымі ранамі — праходзяць лячэнне амбулаторна.

## ЛАВІЛІ ШЧУПАКОЎ «ПАВУКОМ»...

**На возеры ў Жыткавіцкім раёне работнікі Любанскай міжраёнінспекцыі затрымалі траіх жыхароў суседняга Салігорскага раёна, якія лавілі шчупакоў пад'ёмнікам («павуком»).**

Парушальнікі «рыбачылі» каля помпавай станцыі, дзе рыба ідзе на свежую ваду. Незаконны ўлоў — 91 асобіна шчупака вагой 65 кілаграмаў — абыдзецца ім у 20 тысяч рублёў. Распачата крымінальная справа, паведамілі ў Дзяржінспекцыі.

60 асобін шчупака вылавіў двума кошыкамі з металічнай сеткі жыхар вёскі Дубінка Гродзенскага раёна. Мужчына браканьернічаў забароненымі прыладамі на рацэ Яжовіца, там яго і затрымалі дзяржінспектары. Вага незаконнага ўлову — амаль 20 кілаграмаў, прычыненая прыродзе шкода ацэньваецца ў 13 230 рублёў.

З 43-метровай сеткай выйшлі на ваду двое жыхароў вёскі Чухава Пінскага раёна. На вадасховішчы Пагост яны вылавілі 14 шчупакоў вагой сем кілаграмаў і пяць асобін рыбы іншых відаў. Гэтага было дастаткова, каб шкода перавысіла 100 базавых велічынь, бо падчас нерасту яна вылічаецца ў трайным памеры. Мужчыны ўжо пакрылі 3,5 тысячы рублёў за незаконна здабытую рыбу, тым не менш іх могуць прыцягнуць да крымінальнай адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**